# 1941 год: последние месяцы мирной жизни Брестчины

Б. С. С. Р.
Брестский облисполком
Отдел Торговли
«11» III 1941 г.
№ 164
г. Брест: тел. № 83

Кобринскому Исполкому Райсовета

к делу

до сведения

132

РАСПОРЯЖЕНИЕ № 1/424

Председателя Исполкома Брестского Областного Совета депутатов трудящихся.

11 марта 1941 г. г. Брест.

В связи с неудовлетворительным ходом выполнения плана товарооборота по торгующим организациям Области, а по отдельным торгорганизациям/ Межрайторг, Военторг, Транстрогпит, СПС/ выполнения плана под явной угрозой срыва и в целях притока сельскохозяйственных продуктов на рынок, предлагаю Областному Отделу Торговли провести следующие мероприятия:

а/ с 17–19 марта с. г. провести в гор. Бресте Межобластную ярмарку, с привлечением для участия в ярмарке следующих торгующих организаций:

Межрайторг
Военторг
Спецторг
Транстогпит
Речторгтранс
Гастроном
Брестский РПСоюз
Многопромсоюз
Лесдревхимсоюз
Когиз
Белгиз

б/ На ярмарку вывезти товаров/ швейные изд., трикотаж, галантерея, парфюмерия, хозтовары, ботинки и друг./ не менее чем на 2500 т. руб.–

2. Обязать Многопромсоюз т. Гусенка, Лесдревхимсоюз т. Иванова и Облместпром т. Дубовика не позже 15.III. сдать торгующим организациям все наличие выработанной продукции.

3. Обязать руководителей торгующих организаций не позже 13.III. составить ассортимент товаров, которые будут вывезены на ярмарку и к указанному сроку представить Облторготделу.

4. Обязать Председателей Исполкомов Райсоветов между 18–19.III. с. г. провести в Райцентрах ярмарки, обязав все артели и Райпромкомбинаты не позже 16.III. с. г. сдать торгующим организациям все наличие готовых изделий в артелях и Р.комбинатах, а также к указанному сроку обеспечить получение Райсоюзом с баз промышленности товаров по фондам первого квартала.–

5. Обязать Председателя Исполкома Городского Совета т. Раецкого привести в праздничный вид базар гор. Бреста, украсить лозунгами, плакатами и оказать помощь торгующим организациям в предоставлении помещений под временные ларьки, киоски и магазины.–

6. Обязать Председателей Исполкомов Брестского, Каменецкого, Кобринского и Малоритского районов широко оповестить население о предстоящей ярмарке и участие крестьян на ярмарке с привозом своих сельско-хозяйственных продуктов.–

7. – Облторготделу о выполнении настоящего распоряжения по каждому району в отдельности докладной запиской доложить мне 25.III.1941 года.–

Председатель Исполкома Брестского Областного Совета / Дугашевский/

Верно: [signature]

**Распоряжение председателя Брестского облисполкома от 11.03.1941 о проведении областной ярмарки в г. Бресте**

Ф. 282. Оп. 2. Д. 24. Л. 132.

1

П О С Т А Н О В Л Е Н И Е

Исполнительного Комитета Брестского Городского Совета
Депутатов Трудящихся

от 27 апреля 1941 г.

О местном бюджете города Бреста на 1941 год.

Рассмотрев представленный Городским Финансовым Отделом проект местного бюджета города, составленный в соответствии с утвержденными Областным Советом Депутатов Трудящихся контрольными цифрами, Исполнительный Комитет Городского Совета Р Е Ш И Л :

1. Утвердить на 1941 год местный бюджет города по:
а/ доходам в сумме 14658,6 т.р.
б/ расходам " 14002,6 т.р. с превышением доходов над расходами /с остатком бюджетных средств/ на 1/1-1942 года в сумме 656,0 т.р..

2. Распределение расходной части бюджета в соответствии с составленными индивидуальными сметами и расчетами учреждений, утвердить в следующем разрезе:

| | | |
|---|---|---|
| 1/ на | финансирование местной промышленности в сумме | 57,1 т.р. |
| 2/ " | финансирование сельского хозяйства | 32,1 т.р. |
| 3/ " | финансирование коммунального и жилищ. х-ства | 1855,7 т.р. |
| | В том числе: а/ на новое мощение улиц ..... | 550,0 т.р. |
| | б/ " капремонт жилого фонда | 712,5 т.р. |
| 4/ " | расходы по благоустройству базаров ........ | 87,5 т.р. |
| 5/ " | народное образование ...................... | 5381,0 т.р. |
| 6/ " | здравохранение ............................ | 4629,8 т.р. |
| 7/ " | физическую культуру ....................... | 35,0 т.р. |
| 8/ " | социальное обеспечение .................... | 61,8 т.р. |
| 9/ " | содержание пожарной охраны ................ | 663,7 т.р. |
| 10/ " | содержание вытрезвителя ................... | 130,0 т.р. |
| 11/ " | регулирование уличного движения ........... | 35,0 т.р. |
| 12/ " | у п р а в л е н и е ...................... | 488,0 т.р. |
| 13/ " | прочие расходы ............................ | 545,9 т.р. |
| | В том числе: на содержание спасательной станции на реке "Мухавец" | 97,0 т.р. |

3. Об"ем капит. строительства утвердить в сумме 983,0 т.р.
В том числе:

| | | |
|---|---|---|
| на | строительство новой средней школы на 560 мест | 600,0 т.р. |
| " | окончание стр-ства Сталинской школы .... | 120,0 т.р. |
| " | окончание стр-ства школы в Южн. Городке | 73,0 т.р. |
| " | окончание стр-ства 3-й Городской Больницы | 120,0 т.р. |
| " | присоединение 1-й больницы к канализац. сети | 70,0 т.р. |

4. Установить по бюджету города на 1941 г. фонд заработной платы в сумме ........................................ 4979,0 т.р.

| | | |
|---|---|---|
| В том числе: по | сельскому хозяйству ........ | 23,2 т.р. |
| " | народному образованию ....... | 2438,5 т.р. |
| " | народному здравохранению .... | 1938,1 т.р. |
| " | местным органам Н К В Д .... | 512,3 т.р. |
| " | спасательной станции "Освод" | 66,9 т.р. |



2

5. Утвердить фонды заработной платы по содержанию органов управления в сумме ........................................ 371,6 т.р.
В том числе:

| | | |
|---|---|---|
| по | Отделу Местной Промышленности ..... | 11,2 т.р. |
| " | Отделу Городской Торговли ......... | 17,1 т.р. |
| " | Отделу Коммунального хозяйства .... | 43,2 т.р. |
| " | Жилищному Управлению .............. | 36,6 т.р. |
| " | Отделу Народного Образования ...... | 52,6 т.р. |
| " | Отделу Здравохранения ............. | 40,9 т.р. |
| " | Городскому Комитету Физкульт. и Спорта | 18,5 т.р. |
| " | Отделу Социального Обеспечения .... | 20,6 т.р. |
| " | Городскому Бюро З А Г С ......... | 10,3 т.р. |
| " | Общему Отделу Горсовета ........... | 101,8 т.р. |
| " | Городской Плановой Комиссии ....... | 18,8 т.р. |

6. Предложить Городскому Финансовому Отделу обеспечить полное и своевременное выполнение всех доходов по бюджету, установить строжайший контроль за правильным и своевременным и по прямому назначению использованием бюджетных ассигнований.

7/ Обязать всех Зав. Отделами и руководителей бюджетных учреждений расходование средств по бюджету производить исключительно в пределах месяцев кассовых планов, ни в коем случае не допускать ни одного рубля перерасходов.

ПРЕДСЕДАТЕЛЬ ГОРОДСКОГО СОВЕТА ДЕПУТАТОВ ТРУДЯЩИХСЯ / БОРИСОВ /

ОТВ. СЕКРЕТАРЬ ГОРСОВЕТА / ЗВАНСКИЙ /

**Постановление Брестского горисполкома от 27.04.1941 об утверждении бюджета г. Бреста на 1941 год**

Ф. 783. Оп. 1. Д. 283. Л. 1, 2.

## Брест

Второй раз трудящиеся молодого советского города свободно и радостно собрались на первомайскую демонстрацию. Первыми мимо трибуны прошли учащиеся ремесленных училищ — будущие слесаря, токари, столяры, кузнецы — трудовые резервы социалистической промышленности. За ними шли школьники города, учащиеся педучилища, железнодорожного техникума, рабочие лесозаводов, швейной и обувной фабрик, типографий, кустарно-промысловых артелей, железнодорожники, строители, советская интеллигенция, крестьяне из ближайших колхозов и деревень Брестского района.

Великий пролетарский праздник трудящиеся города встретили новыми производственными подарками матери-родине. Об этом они рапортовали в день 1 мая.

Вот идет колонна рабочих главных вагонных мастерских. Лаконичные надписи на красиво оформленных щитах, которые несут рабочие, красноречиво говорят о достижениях их предприятия. Апрельский план по капитальному ремонту товарных вагонов мастерские выполнили на 120 проц. Полностью выполнено задание по среднему ремонту вагонов. Цех капитального ремонта товарных вагонов, которым руководит тов. Пашковский, завоевал первенство в предмайском социалистическом соревновании.

Лозунги, транспаранты, диаграммы, которыми красочно оформлены колонны, рассказывают о победах, достигнутых народом, освобожденным из-под панского ига. На разных языках — русском, белорусском, польском, еврейском — они славят великого Сталина, коммунистическую партию, советское правительство, зовут к новым победам на славу родины.

...13 часов. По площади разносятся звуки веселого белорусского танца «Лявониха». Лучшие танцоры многочисленных коллективов художественной самодеятельности города продемонстрировали свое мастерство.

Всего в первомайской демонстрации города приняло участие 35.000 человек.

Накануне 1 мая в городском театре состоялось торжественное заседание партийных, советских, профсоюзных и комсомольских организаций совместно с представителями частей Красной Армии. 30 апреля, а также 1 и 2 мая праздничные вечера состоялись на предприятиях, в учреждениях, школах.

Весело провели трудящиеся пограничного Бреста великий пролетарский праздник.

Я. МАКСИМОВ.

**Заметка о первомайской демонстрации трудящихся 1941 года в городе Бресте**

Газета «Советская Белоруссия» за 4 мая 1941 г.

ЦЭНТРАЛЬНЫ СОВЕТ АСОАВІЯХІМА СССР

ПРАВОДЗІЦЬ

РЭАЛІЗАЦЫЮ БІЛЕТАЎ

## 15-Й УСЕСАЮЗНАЙ ЛАТАРЭІ АСОАВІЯХІМА

СРОДКІ АД РЭАЛІЗАЦЫІ ЛАТАРЭІ ПРЫЗНАЧАЮЦЦА НА ЎМАЦАВАННЕ МАСАВА-АБАРОННАЙ РАБОТЫ АСОАВІЯХІМА.

Па білетам 15-й латарэі будзе разыграна 310.250 выйгрышаў на агульную суму 31.250.165 рублёў.

У ЛІКУ ВЫЙГРЫШАЎ МАЮЦЦА:

- 1 легкавы аўтамабіль „ЗІС-101"
- 37 легкавых аўтамабіляў „М-І"
- 64 легкавых малалітражных аўтамабілі
- 102 матацыклы без каляскі
- 93 піяніна
- 189 радзіол
- 90 радыёпрыёмнікаў „СВД-9"
- 357 адрэзаў на касцюмы
- 434 веласіпеды
- 52 фотаапараты „ФЭД"
- 1201 ручных гадзіннікаў
- 115 адрэзаў на пальто
- 2988 патэфонаў
- 1245 карманных гадзіннікаў
- і вялікая колькасць другіх каштоўных выйгрышаў.

Білеты можна набыць ва ўсіх арганізацыях Асоавіяхіма.

**Грамадзяне, набывайце білеты 15-й Усесаюзнай латарэі Асоавіяхіма!**

**УМАЦОЎВАЙЦЕ АБАРОНУ СССР!**

**Брэсцкі аблсовет Асоавіяхіма.**

СЁННЯ Ў КІНОТЭАТРАХ

Кінотэатр 1 МАЯ „ЗАКЛЮЧОНЫЯ"
Пачатак сеансаў 5, 7, 9, 11

Кінотэатр „КІМ" ЛЮДЗІ НАШАГА КАЛГАСА
Пачатак сеансаў 5, 7, 9, 11

ГОРТЭАТР

Гастролі дзяржаўнага польскага тэатра БССР

Сёння 7 мая

БОМАРШЕ

## ЖАНІЦЬБА ФІГАРО

пастаноўшчык і рэжысёр
**А. М. ВЕНГЕРКА**

Пачатак 8 гадз. 30 мін.
Білеты ў касе тэатра, тэл. 321.
Калектывам скідка

TEATR MIEJSKI

Gościnne występy państwowego teatru polskiego BSRR

Dziś 7 maja

BEAUMARCHAIS

## WESELE FIGARA

Inscenizacja i reżyseria
**Aleksander Węgierko**

Początek 8.30.
Bilety w kasie teatru, tel. 321.
Kolektywom ulgi.

## Смаленскі Дзяржаўны Стаматалагічны Інстытут

**АБ'ЯЎЛЯЕ НАБОР СТУДЭНТАЎ на 1941/42 вучэбны год.**

Інстытут рыхтуе ўрачоў-стаматолагаў, спецыялістаў па хваробах зубоў, поласці рота і чэлюсна-тваравай сістэмы.

**Тэрмін навучання 4 годы.**

У інстытут прымаюцца грамадзяне Саюза ССР ва ўзросце ад 17 да 35 год, якія маюць закончаную сярэднюю адукацыю, або атрымаўшыя атэстат аб сканчэнні сярэдняй школы ў парадку экстэрната.

Закончыўшыя дзесяцігодку з атэстатам выдатніка прымаюцца без іспытаў.

Прыём заяў аб паступленні ў інстытут з 20 чэрвеня па 13 ліпеня.

Прыёмныя іспыты будуць вытварацца з 1 па 20 жніўня: па рускай мове і літаратуры, фізіцы і хіміі.

З ліку прынятых на стыпендыю залічваюцца выдатнікі, якія прыняты без іспытаў, а таксама атрымаўшыя на прыёмных іспытах 2—3 адзнакі „выдатна" і астатнія не ніжэй „добра".

Іншагародніх інстытут забяспечвае інтэрнатам за плату.

Заявы з дакументамі (арыгіналамі) накіроўваць па адрасу: г. Смаленск, вул. Пржэвальскага д. № 6, Стаматалагічны інстытут тэл. 3—32—88.

**ДЫРЭКЦЫЯ.**

# Объявления, опубликованные в газете «Заря» за 7 мая 1941 г.

## ГАРАДСКАЯ АЛІМПІЯДА ДЗІЦЯЧАЙ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ

Чацвёрты дзень у Брэсце праходзіць гарадская алімпіяда дзіцячай мастацкай творчасці. У ёй удзельнічаюць дзесяткі калектываў мастацкай самадзейнасці школ і Дома піянераў. Больш 500 выканаўцаў: танцораў, музыкантаў, дэкламатараў, спевакоў.

Пастаноўкай п'есы «Паўлік Марозаў» —Якаўлева ў Брэсцкім драматычным тэатры пачаў алімпіяду калектыў самадзейнасці Дома піянераў. Пастаноўка прайшла з вялікім поспехам.

Не раз захапляюцца гледачы маленькімі артыстамі, танцорамі, музыкантамі. Вось выступае ансамбль песні і пляскі Дома піянераў. Велічава і ўрачыста гучыць песня аб вялікай партыі Леніна-Сталіна — «Агні большэвіцкіх ідэй», за ёй следуе «Песня чырвоных палкоў», песня аб слаўным палкаводцы Шчорсе.

На рускай, беларускай, польскай, яўрэйскай мовах гучаць радасныя песні. Вось на сцэне вялікі хор вучняў 10-й школы. З натхненнем і захапленнем выконвае ён на яўрэйскай мове «Песню аб Сталіне», песню «Ля калодзежа» і на рускай мове выконвае «Песню молодости». Добра выканаў хор навучаючыхся 5-й сярэдняй школы пад кіраўніцтвам Петручыка «Песню аб Варашылаве» музыка Александрава, «Выпраўляла маці сына». Асабліва цікава быў выканан вучанямі 5-й сярэдняй школы пад кіраўніцтвам тав. Хмялеўскай балет «Золушка». Вучні 5-й школы выдатна афармілі літмантаж на тэму «Пісьмо беларускага народа вялікаму Сталіну».

Увесь канцэрт, усе выступленні ярка і даходчыва расказваюць аб шчаслівым дзяцінстве, аб росквіце маладых талентаў.

11 мая адбудзецца заключны канцэрт гарадской алімпіяды дзіцячай мастацкай творчасці.

# Репортаж о Брестской городской олимпиаде детской художественной самодеятельности

Газета «Заря» за 8 мая 1941 г.

ПРОТОКОЛ № 74

ЗАСЕДАНИЯ БЮРО БРЕСТСКОГО ОБКОМА КП/б/Б

От 10 мая 1941 года.

…ШАЛИ: § 7. Об утверждении репертуарного плана Брестского Областного Русского драматического театра на 1941 г.

/тов.БЕЛЯЕВ/.

…ТАНОВИЛИ: Утвердить представленный Областным отделом по делам Искусств репертуарный план Брестского Областного Русского

Драматического Театра на 1941 год с включением следующих пьес:

| | | |
|---|---|---|
| 1. Опасный поворот | - | Пристли |
| 2. Слава | - | Гусев |
| 3. Самодуры | - | Гольдони |
| 4. Бронепоезд "Мстислав Удалой" | - | И.Прут |
| 5. Кто смеется последний | - | Крапива |
| 6. Три сестры | - | Чехов |
| 7. Овод | - | Войнич |
| 8. Чудо над Бугом | - | Л.Никулин |

СЕКРЕТАРЬ БРЕСТСКОГО ОБКОМА КП/б/Б /М.ТУПИЦЫН/

…тп.6 экз.

**Из протокола № 74 заседания бюро Брестского обкома КП(б)Б от 10.05.1941 об утверждении репертуарного плана Брестского областного русского драматического театра на 1941 год**

Ф. 1-П. Оп. 1б. Д. 33. Л. 56, 64, 65, 73.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

ИСПОЛКОМА БРЕСТСКОГО ОБЛСОВЕТА ДЕПУТАТОВ ТРУДЯЩИХСЯ
И ОБКОМА КП/б/Б

От 19 мая 1941 года.

ОБ ОЧЕРЕДНОМ ПРИЗЫВЕ ГОРОДСКОЙ, КОЛХОЗНОЙ И ДРУГОЙ СЕЛЬСКОЙ МОЛОДЕЖИ В ШКОЛЫ ФАБРИЧНО-ЗАВОДСКОГО ОБУЧЕНИЯ ПО БРЕСТСКОЙ ОБЛАСТИ".

В соответствии с постановлением СНК Союза ССР и ЦК ВКП/б/ от 22 апреля 1941 года "О подготовке государственных трудовых резервов в школах фабрично-заводского обучения, ремесленных и железнодорожных училищах в 1941 году", - Исполком Облсовета депутатов трудящихся и Обком КП/б/Б - п о с т а н о в л я ю т:

1. Обязать исполкомы Горсоветов и Райсоветов, ГК и РК КП/б/Б провести в период с 5 по 20 июня 1941 г. очередной призыв в школы фабрично-заводского обучения из числа городской, колхозной и другой сельской молодежи мужского пола 1740 чел. в возрасте 17 лет.

2. Обязать исполкомы Горсоветов и Райсоветов, ГК и РК КП/б/Б провести широкую массово-раз"яснительную работу среди трудящейся молодежи о задачах подготовки трудовых резервов, добиваясь при этом подачи молодежью максимального числа заявлений о добровольном поступлении в школы ФЗО.

3. Обязать Обком ЛКСМБ обеспечить проведение организационной и массовой работы среди трудящейся молодежи Райкомами ЛКСМ и первичными комсомольскими организациями с тем, чтобы очередной призыв в школы ФЗО прошел на высоком политическом уровне.



93

4. Обязать исполкомы Райсоветов и РК КП/б/Б, исходя из контингентов призыва по районам, установить к 25 мая 1941 г. количество призываемых из числа колхозной и сельской молодежи по каждому колхозу и сельскому совету.

5. Обязать нач. Обл. Упр. Труд. Резервов тов. ЖУКА в пятидневный срок представить на утверждение распределение контингента призываемой молодежи в разрезе каждой школы ФЗО по Брестской области, а также для укомплектования школ ФЗО других областей.

ПРЕДСЕДАТЕЛЬ ИСПОЛКОМА БРЕСТСКОГО ОБЛСОВЕТА ДЕПУТАТОВ ТРУДЯЩИХСЯ
/К. ДЛУГОШЕВСКИЙ/

СЕКРЕТАРЬ БРЕСТСКОГО ОБКОМА КП/б/Б
/М. ТУПИЦЫН/

Брэсцкі Абласны Камітэт КП(б)Б — Брестский областной комитет КП(б) Белорусcии — 037

/гк/

**Постановление Брестского облисполкома и Брестского обкома КП(б)Б от 19.05.1941 о проведении призыва молодежи в школы фабрично-заводского обучения по Брестской области**

Ф. 1-П. Оп. 1б. Д. 33. Л. 92, 93.

ПРОТОКОЛ № 77

ЗАСЕДАНИЯ БЮРО БРЕСТСКОГО ОБКОМА КП/б/Б

От 19 мая 1941 года.

СЛУШАЛИ: § 4. Об участии физкультурной делегации Брестской области во Всебелорусском физкультурном параде в г.Минске.
/тов.БУРКОВ/.

ПОСТАНОВИЛИ: Придавая большое значение участию физкультурной организации Брестской области во Всебелорусском физкультурном параде в г.Минске, - Брестский Обком КП/б/Б ПОСТАНОВЛЯЕТ:

1.Принять участие во Всебелорусском физкультурном параде в г.Минске 29 июня 1941 г. делегацией в составе 120 физкультурников.

2.Утвердить предложенные Облкомитетом по делам ФК и спорта тему и сценарий выступления.

3.Утвердить комиссию по подготовке выступления Брестской облфизкультурной делегации в составе т.ДРУЖИНИНА - председатель комиссии, т.т.МАЗУРОВА, ФИАЛКИНА, БУРКОВА и АБРАСИМОВА.

4.Поручить исполкому Облсовета депутатов трудящихся ассигновать необходимые средства для подготовки Брестской физкультурной делегации к участию во Всебелорусском параде в г.Минске.

5.Обязать Облторготдел и Облплан обеспечить по заявкам Облкомитета по делам ФК и спорта необходимыми спорткостюмами и материалами для физкультурной делегации.

6.Обязать Обком комсомола принять активное участие в подготовке и проведении физкультурного парада, обратив особое внимание на подбор участников физкультурной делегации Брестской области.

СЕКРЕТАРЬ БРЕСТСКОГО ОБКОМА КП/б/Б /М.ТУПИЦЫН/

**Из протокола № 77 заседания бюро Брестского обкома КП(б)Б от 19.05.1941 об участии физкультурной делегации Брестской области во Всесоюзном физкультурном параде в г. Минске**

Ф. 1-П. Оп. 1б. Д. 33. Л. 80, 83, 91.

# АДКРЫЦЦЁ ЛЕТНЯГА СПАРТЫЎНАГА СЕЗОНА

У выхадны дзень, 18 мая, у г. Брэсце адбылося адкрыццё летняга спартыўнага сезона. У спаборніцтвах, якія закончыліся позна вечарам, прыняла ўдзел каля 1·500 фізкультурнікаў.

Гарадское фізкультурнае свята ў 11 гадзін раніцы адкрылі ўдзельнікі веснавога традыцыйнага кроса імені Маршала Совецкага Саюза таварыша Варашылава — байцы і камандзіры гераічнай Чырвонай Арміі. Пачотнае першае месца ў дыстанцыі на тры кілометры заняў лейтэнант Жэндзінскі. Яго час 10 мінут 43 секунды. Добры рэзультат паказаў малодшы палітрук Гладкоў, які адлегласць у адзін кілометр пакрыў за 3 мінуты 3 секунды.

У праведзенай гарадскім камітэтам па справах фізкультуры і спорта эстафеце прынялі ўдзел фізкультурныя калектывы спартыўных таварыстваў «Дынама», «Спартак», а таксама фізкультурнікі рамесленых вучылішчаў і школ горада. На першае месца выйшла каманда «Спартак».

Цікавымі былі веласіпедныя гонкі на дарожных і гоначных веласіпедах. Акрамя брэсцкіх веласіпедыстаў, спаборніцтва за першынства на дыстанцыі для мужчын — 30 кілометраў і жанчын — 10 кілометраў прыехалі аспрэчваць лепшыя веласіпедысты з Кобрынскага, Пружанскага, Камянецкага, Косаўскага і Брэсцкага раёнаў.

...Ля старта ў напружаным чаканні выстраіліся ўдзельнікі велагонак, у колькасці 38 чалавек. Ідуць апошнія прыгатаванні. Праглядваецца спраўнасць веласіпедаў. Нарэшце падаецца доўгачаканая каманда. Адзін за адным імкліва зрываюцца са старта веласіпедысты. Іх ветліва праважаюць прысутныя гледачы.

У чаканні непрыкметна праходзіць 58 мінут. Першым да фінішу прыходзіць тав. Шыманскі (спартыўнае таварыства «Дынама» г. Брэст), які ўпершыню ўдзельнічаў у велагонках. На 1 мінуту 20 секунд пазней фінішыраваў і заняў другое месца фізкультурнік спартыўнага таварыства «Спартак» тав. Тэрлікоўскі (г. Брэст). Дыстанцыя ў 30 кілометраў ім пакрыта за 59 мінут 20 секунд. Трэцяе месца ў велагонках на гоначным веласіпедзе заняў тав. Дранько (спартыўнае таварыства «Дынама» г. Брэст). Ён толькі на 10 секунд адстаў ад тав. Тэрлікоўскага.

Сярод удзельнікаў велагонак на дарожных машынах першае месца заняў тав. Фрыдман (Пружаны) з рэзультатам 64 мінуты 45 секунд; другое месца тав. Нікадзімюк (Камянец) — 64 мінуты 50 секунд; трэцяе тав. Мартысюк (Брэсцкі раён) — 65 мінут.

У выніку спаборніцтва на дыстанцыю ў 10 кілометраў першае, другое і трэцяе месца паміж сабой падзялілі веласіпедысткі т. т. Карніеўская (Косава), Галембіцкая (Кобрын) і Стрэжэлецкая (Косава).

Увагу гледачоў прыцягнулі таксама праходзіўшыя ў спартыўнай зале Дома фізкультуры усесаюзныя завочныя спаборніцтвы па штанзе (жым, рывок і штуршок двума рукамі). Лепшых вынікаў у гэтых спаборніцтвах дасягнулі: у лягчэйшай вазе тав. Ільін («Лакаматыў»), які падняў 150 кілограм; у поўлёгкай вазе тав. Гаўрыкаў (ДЧА) — 180 кілограм; у лёгкай вазе тав. Баркоўскі («Лакаматыў») — 225 кілограм, у сярэдняй вазе тав. Коган (ДЧА) — 257 кілограм; у поўцяжкай вазе тав. Саулаў (ДЧА) — 262,5 кілограма; у поўцяжкай вазе тав. Герасімаў («Лакаматыў») — 265 кілограм.

Больш трох тысяч гледачоў, а таксама «балельшчыкаў» розных узростаў з'явілася на стадыён добраахвотнага спартыўнага таварыства «Спартак», дзе працягвалася фізкультурнае свята. Нават стадыён у гэты прыгожы сонечны дзень выглядаў неяк па-святочнаму. Насупроць трыбуны красуюцца ўстаноўленыя велізарныя скульптуры вялікіх правадыроў народа таварышоў Леніна і Сталіна. Грае аркестр.

...Пачынаецца парад фізкультурнікаў. Уперадзе праходзяць сцяганосцы. Яны нясуць сцягі добраахвотных спартыўных таварыстваў «Дынама», «Спартак», «Лакаматыў» і інш. За імі парадным крокам бадзёра ідуць фізкультурнікі. Парад прымае старшыня Брэсцкага гарадскога камітэта па справах фізкультуры і спорта тав. Хвашнянскі.

Пасля парада юныя фізкультурнікі — вучні школ горада, а таксама фізкультурнікі добраахвотных спартыўных таварыстваў — прадэманстравалі перад гледачамі восем практыкаванняў тыпа зарадкі, камбініраваныя практыкаванні з кіямі, абручамі і лентамі.

У 6 гадзін 30 мінут пачалася таварыская сустрэча па футболу паміж камандамі «Спартак» — «Дынама». Ігра закончылася перамогай спартакаўцаў лікам 9:2.

Вечарам у шахматна-шашачным клубе Дома фізкультуры лепшым шахматыстам горада Брэста тав. Шпігельмахерам была прачытана лекцыя аб выніках 12 Усебеларускага шахматнага чэмпіяната і дадзен сеанс адначасовай ігры на 26 дошках. З іх тав. Шпігельмахер пяць партый зрабіў унічыю і 21 выйграў.

А. Кацубо.

**Заметка о физкультурном празднике в г. Бресте**

Газета «Заря» за 21 мая 1941 г.

## ЯК БУДЗЕ ВЫГЛЯДАЦЬ ВУЛІЦА ЛЕНІНА Ў БРЭСЦЕ.

У плане рэканструкцыі горада Брэста вялікая ўвага ўдзяляецца пераўтварэнню вуліцы імені Леніна ў прыгожы бульвар. Ужо ў гэтым годзе на рэканструкцыю вуліцы асігнавана каля 500 тысяч рублёў. Днямі распачынаюцца работы па рэканструкцыі.

Вуліца будзе выглядаць прыблізна такім чынам: з абодвух бакоў шырынёй у шэсць метраў кожная будуць праходзіць маставыя, па баках іх тратуары па пяць метраў і, акрамя таго, два метры траўнікоў з растучымі на іх дрэвамі. Пасярэдзіне вуліцы бульвар шырынёй у 25 метраў з газонамі, чатырма радамі дрэў, кустарнікаў, двума алеямі і двума веласіпеднымі дарожкамі.

Работы ў гэтым годзе пачнуцца на ўчастку ад вуліцы Маскоўскай да Пушкінскай.

**М. Здзехоўскі.**

**Заметка о планируемой реконструкции ул. Ленина в городе Бресте**

Газета «Заря» за 22 мая 1941 г.

## Работа рынкаў горада Брэста

Упраўленне Брэсцкімі рынкамі ад моманту свайго існавання — 19 сакавіка 1940 года — прарабіла нямалую работу па арганізацыі культурнага і санітарнага гандлю на рынках.

У 1940 годзе на вялікім рынку былі пабудаваны сталы колькасцю ў 120 месц і два вагавыя пункты, а на малым — 60 месц і адзін вагавы пункт. Закуплен неабходны інвентар (55 вагаў з гірамі), загатаваны фартухі, халаты, нарукаўнікі для сялян, гандлюючых мясам, арганізавана разрубка мяса, якой займаюцца спецыялісты-рубшчыкі.

Зборшчыкі рынка глядзяць не толькі за поўным забеспячэннем збору, а і за тым, каб на рынку прадаваліся прадукты добрай якасці. Малако дазваляецца прадаваць толькі пасля праверкі малочна-кантрольнай станцыі. Мяса не дапускаецца к продажу, калі на ім няма кляйма мяса-кантрольнай станцыі.

Каштарыс па паляпшэнню рынкаў у 1941 годзе зацверджан выканкомам горсовета ў суме 230 тысяч рублёў.

Сярод работнікаў рынка ёсць стаханаўцы, якія выконваюць і перавыконваюць месячныя планы. Тав. Вайтушкевіч выконвае план на 115 процантаў, тав. Лен — на 110 процантаў. Добра працуюць прыбіральшчыцы рынка — Кунец Ліда, Баунава Марфа.

Сярод работнікаў рынка вядзецца культурна-масавая работа. Два разы ў тыдзень праводзіцца чытка газет. Выпускаецца насценгазета «За калгасны гандаль». Інструктар тав. Малевіч абучае грамаце неісьменных і малапісьменных работнікаў.

Аднак патрэбна адзначыць, што ў рабоце рынкаў ёсць і недахопы. Ёсць яшчэ выпадкі, калі сяляне прадаюць мяса прама з вазоў. І, безумоўна, такі гандаль з'яўляецца антысанітарным. Тлумачыцца такое становішча тым, што некалькі радоў, якія па рашэнню выканкома горсовета павінны былі перайсці ў веданне ўпраўлення рынкаў, да гэтага часу яшчэ не вызвалены арганізацыямі, як міжрайгандлем, мясакамбінатам і г. д. Не гледзячы на неаднаразовыя заўвагі з боку ўпраўлення рынкаў аб выкананні рашэння горсовета, вышэй указаныя арганізацыі прадаўжаюць займаць нашы памяшканні.

**Шрайбман А. Я.**

**Заметка о работе рынков города Бреста**

Газета «Заря» за 24 мая 1941 г.

## Абаронная работа сярод прызыўнікаў

Перад прызыўнікамі пастаўлена вялікая задача па авалодванню мінімумам ваенных ведаў. Зараз у Поразаўскім раёне гэта работа ў поўным разгары.

Пастанова Цэнтральнага Совета Асоавіяхіма аб стварэнні сярод прызыўнікаў груп па вывучэнню абароннага мінімума ўзняла ў іх вялікую цягу да набыцця ваенных ведаў.

Вылучаны лепшыя інструктары для абучэння прызыўнікаў. Усе прызыўнікі актыўна наведваюць заняткі, уважліва слухаюць выкладчыкаў.

Зараз амаль ва ўсіх групах закончана вучэнне па праграме здачы норм на значок ППХА. Камісія пры райсовеце Асоавіяхіма прымае нормы і правярае засваенне пройдзенага матэрыялу.

Прызыўнікі паспяхова вывучаюць статуты Чырвонай Арміі і займаюцца баявой падрыхтоўкай. Асабліва добра наладжана вывучэнне абароннага мінімума ў групах Бярозаўскага, Шурыцкага, Падароскага сельсоветаў.

Аднак вельмі дрэнна абстаіць справа з фізпадрыхтоўкай. Не толькі ў сельсоветах, нават у раённым цэнтры няма спартыўнага гарадка і спартыўнай пляцоўкі. Райсовет фізкультуры (старшыня т. Кошэлеў) нічога не робіць у гэтым напрамку. Раней арганізаваныя фізкультурныя калектывы зусім перасталі працаваць.

Падрыхтаваныя інструктары фізкультуры не працуюць з-за адсутнасці належнага спартыўнага інвентара і абсталявання, і гэта зусім не клапоціць райсовет фізкультуры і спорта.

На гэты асноўны і вялікі недахоп неабходна звярнуць максімум увагі. На хаду перабудаваць работу з тым, каб своечасова забяспечыць праходжанне праграмы па фізкультурна-спартыўнаму мінімуму.

Л. Канаваленка.

**Заметки о военной подготовке призывников и проведении образовательно-воспитательной работы среди допризывников**

Газета «Заря» за 24 мая 1941 г.

## РЫХТУЮЦЦА БЫЦЬ МУЖНЫМІ ВОІНАМІ

Па-баявому рыхтуюцца дапрызыўнікі вёскі Скураты, Альшаніцкага сельсовета, Косаўскага раёна, да прызыва ў рады доблеснай Чырвонай Арміі.

Каб прыйсці ў Чырвоную Армію высока культурнымі, палітычна адукаванымі, дапрызыўнікі гэтай вёскі па сваёй асабістай ініцыятыве сталі наведваць вячэрнія заняткі пры школе. Настаўніцы Халікіна і Градоўская Скуратаўскай школы адгукнуліся на просьбу маладых дапрызыўнікаў і старанна праводзілі ўсю зіму з імі заняткі.

Нядаўна тут адбыліся выпускныя праверачныя экзамены. З агульнага ліку дапрызыўнікаў, наведваўшых школу, 16 чалавек здалі іспыты за 4 класы пачатковай школы. 6 дапрызыўнікаў з гэтага ліку ўсе прадметы на іспытах здалі толькі на выдатна.

У сучасны момант з дапрызыўнікамі праводзяцца ваенныя заняткі. Яны вывучаюць страявую падрыхтоўку, статут «Каравульнай службы», «Баявы статут пяхоты», вінтоўку і іншае. 24 дапрызыўнікі ўжо здалі нормы на значок ППХА. Многія здалі нормы на ГПА і ГСА. 14 дапрызыўнікаў уступілі ў арганізацыю Асоавіяхіма і прымаюць актыўны ўдзел у наладжванні абароннай работы.

Кожны малады патрыёт гарыць жаданнем хутчэй пайсці ў рады гераічнай Чырвонай Арміі. Для гэтага яны зараз выхоўваюць высокія маральныя якасці: вынослівасць, дысцыплінаванасць, каб быць мужнымі воінамі краіны соцыялізма.

Н. Алексеёнак.

# Цікавы футбольны матч

У выхадны дзень, 8 чэрвеня, як звычайна ў час футбольных матчаў, стадыён добраахвотнага спартыўнага таварыства «Спартак» (г. Брэст) быў перапоўнен гледачамі і балельшчыкамі, якія прыйшлі сюды задоўга да пачатку матча.

У 6 гадзін 10 мінут раздаецца працяглы свісток суддзі. На футбольнае поле выбягаюць дзве мацнейшыя каманды: у аранжавых майках — каманда Брэсцкага Дома Чырвонай Арміі і ў сініх майках— каманда Кобрынскага Дома Чырвонай Арміі.

Першыя мінуты ігры праходзяць у напружанай абстаноўцы. Абедзьве каманды не здаюцца і вядуць энергічную атаку. На некалькі секунд ігра пераходзіць да варот брэсцкіх футбалістаў. Мяч усё часцей пападае ў рукі галкіпера. Паступова ход ігры становіцца больш цікавым. Значна павялічваецца тэмп ігры. Адбіўшы напор кобрынскіх форвардаў, брэсцкая каманда Дома Чырвонай Арміі ўзяла ў свае рукі ініцыятыву і змагла правесці рад хуткіх атак. На 20 мінуце яна першая адкрывае лік 1:0 у сваю карысць.

Загнаўшы гол, брэсцкія футбалісты па-ранейшаму вядуць узмоцненае «наступленне». Не адстаюць і кобрынскія футбалісты, якія напорысцей павялі атаку. Праз пяць мінут ім удаецца ўраўняць лік.

Ва ўпартай цікавай барацьбе праходзяць яшчэ 15 мінут. Дзякуючы добра разлічаным пасоўкам (хаця і доўгім), брэсцкія футбалісты ўсё часцей прарываюцца да варот «праціўніка». За 5 мінут да канца першага тайма яны заганяюць у сетку яшчэ адзін гол. Лік 2:1.

Пасля перапынку барацьба працягваецца з неаслабным уздымам. Ля варот кобрынскіх футбалістаў усё часцей ствараліся небяспечныя моманты, два з якіх завяршыліся дакладнымі ўдарамі па варотах.

Усе папыткі кобрынскіх ігракоў адыграцца не далі рэзультатаў. Гэты цікавы матч закончыўся заслужанай перамогай брэсцкіх ігракоў лікам 4:1.

У час ігры сярод футбалістаў каманды Брэсцкага Дома Чырвонай Арміі асабліва вызначыліся ўратар Жураўлёў і левы бек Араянц, якія не раз выратоўвалі свае вароты ад імклівых удараў «праціўніка».

* * *

Вялікую ўвагу прысутных прыцягнулі спаборніцтвы па бегу і велагонках, у якіх прыняў удзел чэмпіён Савецкага Саюза па велакросу тав. Малец.

У забегу на 1.500 метраў прыняло ўдзел 10 фізкультурнікаў — лепшых бегуноў горада. Першым да фініша прыйшоў тав. Хаванскі (дарожна-механічны тэхнікум), які дыстанцыю ў 1.500 метраў прайшоў за 3 мінуты 6,8 секунды. Другое месца заняў фізкультурнік спартыўнага таварыства «КІМ» тав. Якубовіч (4 мінуты 38,9 секунды), трэцяе месца заняў тав. Шубовіч (дарожна-механічны тэхнікум). Яго час—4 мінуты 44.3 секунды.

На першае месца ў камандных велагонках на дыстанцыю ў пяць кіламетраў выйшла каманда таварыства «Спартак» на чале з тав. Малец, другое — каманда «Дынама». Дыстанцыя ў пяць кіламетраў тав. Мальцам пройдзена за 8 мінут 15,2 секунды.

А. Кацуба.

**Репортаж о состоявшемся футбольном матче в г. Бресте**

Газета «Заря» за 10 июня 1941 г.

## У ПАРКУ «1-га МАЯ».

Сотні юнакоў і дзяўчат горада Брэста ў выхадны дзень 8 чэрвеня запоўнілі парк «1-е мая». Тэатр музыкальнай камедыі БССР даў вялікі канцэрт. Артысты выконвалі песні, пляскі і многа іншых мастацкіх нумароў.

Пасля канцэрта на танцавальнай пляцоўцы адбываліся танцы.

Весела правялі выхадны дзень у парку працоўныя горада.

**Заметка о мероприятиях, проведенных в выходной день, в Брестском парке им. 1 Мая**

Газета «Заря» за 10 июня 1941 г.

## Праверачныя Іспыты ў педвучылішчы

Больш 100 юнакоў і дзяўчат навучаецца ў Брэсцкім педагагічным вучылішчы. Яны настойліва авалодваюць ведамі, рыхтуючыся ў недалёкім будучым папоўніць рады савецкіх педагогаў.

Днямі ў вучылішчы пачаліся праверачныя іспыты. Першыя рэзультаты іспытаў сведчаць аб тым, што настаўніцкі калектыў і навучаючаяся моладзь сур'ёзна папрацавалі на працягу навучальнага года.

Першыя іспыты праводзіліся па беларускай мове. Калі ўлічыць тое, што асноўная маса мясцовай моладзі, якая не мела раней магчымасці вучыцца на роднай мове, паступіла ў вучылішча з зусім слабымі ведамі па беларускай мове, то трэба прызнаць рэзультаты зусім здавальняючымі. Так, з 23 чалавек другой групы першага курса, якія пісалі дыктант па белмове, толькі адзін атрымаў ацэнку «дрэнна». Іспыты па вуснай беларускай мове 12 чалавек здалі на «выдатна», 8— на «добра» і 3 — на «пасрэдна».

У гэтым вялікая заслуга выкладчыцы тав. Бадзенковай, якая з пачатку навучальнага года настойліва прывівала навучаючымся навыкі правільнай пісьмовай і вуснай мовы.

Тав. Бадзенкова гаворыць:

— Рэзультаты маглі-б быць яшчэ лепшымі, калі-б усе настаўнікі вялі свае ўрокі на беларускай мове, калі-б яны настойліва патрабавалі ад навучаючыхся культурнай літаратурнай мовы. Аднак некаторыя нашы настаўнікі самі як след беларускай мовай не авалодалі і вядуць заняткі на рускай або на змешанай руска-беларускай мове. І гэта стварае для выкладчыка па мове дадатковыя цяжкасці.

Тав. Бадзенкова бясспрэчна права. Барацьба за культурную мову будучых педагогаў з'яўляецца важнейшым абавязкам усяго калектыва выкладчыкаў.

У асноўным іспыты праходзяць нядрэнна. Ёсць, аднак, некаторыя ненармальнасці. У першыя дні іспытаў сёй-той з навучаючыхся прынёс з сабой у клас кнігі, якімі і карыстаўся ў час праверачных работ.

Неабходна павысіць і патрабавальнасць да ведаў. Вучаніца Т. атрымала ацэнку «пасрэдна», хоць зусім нездавальняюча расказвала пра назоўнікі і прыслоўе.

Гэтыя недахопы трэба выправіць на ходу.

М. Пармон.

**Заметка о проведении в Брестском педагогическом училище экзаменов по белорусскому языку**

Газета «Заря» за 12 июня 1941 г.

# НАВУЧАЛЬНЫ ГОД ЗАКОНЧАН

У гэты сонечны чэрвеньскі дзень асабліва па-святочнаму выглядала дзетвара. З раніцы яна запоўніла вуліцы горада. З чырвонымі сцягамі, лозунгамі вышлі піонеры і школьнікі на дэманстрацыю, прысвечаную заканчэнню навучальнага года. На іх усхваляваных тварах — радасць сёньняшняга дня. Закончыўся навучальны год. Наперадзе — лета, адпачынак, многа цікавага, займальнага. Спорт, праца, цікавыя гульні, экскурсіі, рыбалоўства — запоўняць іх канікулы. Многія рэбяты паедуць у лагеры, многія будуць адпачываць на дзіцячых пляцоўках...

Свята пачалося парадам піонераў, прысвечаным агляду піонерскіх атрадаў. Барабаншчыкі старанна выбіваюць дроб. Стройным крокам, святочна апранутыя, загарэлыя праходзяць піонеры. Лёгкі ветрык развявае на іх грудзях чырвоныя гальштукі. Вось ідуць лепшыя атрады горада і Брэсцкага раёна — піонератрады школ 2, 10, 12, Рэчыцкай няпоўнай сярэдняй школы і другія. Не мець ніводнай дрэннай адзнакі ў атрадзе, узорна паставіць ваенна - фізкультурную работу, каб кожны піонер здаў нормы на значкі БГПА, ГПА, ЮВС, ГСА, і натрэніраваць сябе ў далёкіх пераходах; мець элементарныя працоўныя навыкі: умець шыць, штопаць, убіраць за сабой — такія былі асноўныя ўмовы агляду. Аб выкананні гэтых умоў з гордасцю рапартавалі лепшыя піонерскія атрады.

У кожнага з піонераў на грудзях па некалькі абаронных значкоў. Піонеры ўмеюць арыентавацца на компасу, ведаюць азбуку Морзе, знаёмы з цяжкасцямі пераходаў. Піонерскі атрад Рэчыцкай НСШ, Брэсцкага раёна, зрабіў 60 кілометровы турысцкі паход па ваколіцах сваёй мясцовасці. Многа цікавых падарожжаў арганізуюць рэбяты гэтага атрада ў летнія канікулы...

Пасля дэманстрацыі ўсе школьнікі арганізавана прышлі ў парк імені 1-е Мая. Тут адбыўся мітынг. З паспяховым заканчэннем навучальнага года вітае школьнікаў загадчык аблана тав. Коршук. Ён жадае дзецям добрага, радаснага адпачынку: загарэць, папраўіцца, набрацца сіл, каб прыйсці ў новы навучальны год яшчэ больш бадзёрымі, моцнымі і вучыцца толькі на выдатна і добра. Цёпла віншуе рэбят з заканчэннем вучобы прадстаўнік ЦК ЛКСМБ тав. Расінская.

...Жывой і разнастайнай была праграма дзіцячай самадзейнасці. Яе адкрыў аркестр народных інструментаў Дома піонераў. Ён майстэрскі выканаў некалькі складаных музыкальных твораў. Асаблівай арыгінальнасцю вызначаецца выкананне твора «Утро» кампазітара Грыга. Прыемна песціць слух імітацыя салаўіных трэляў і стройныя акорды юных музыкантаў.

Іх змяняюць харавыя ансамблі, танцавальныя гурткі школ і Дома піонераў. Найбольшай папулярнасцю ў рэбят у гэты дзень карысталіся выканаўцы Дома піонераў. Яны паказалі сябе даравітымі зацейнікамі. І музыканты, і танцоры, і спевакі захаплялі ўсіх сваім майстэрствам. Вучні першай польскай школы добра выканалі нацыянальны польскі танец «Кракавяк». Іх заслужана праважалі рэбяты адабраючымі апладысментамі...

Канцэрт мастацкай самадзейнасці закончан. І тут хочацца некалькі слоў сказаць аб арганізатарах свята. Яны былі тут нейкімі невідзімкамі, ва ўсякім выпадку сярод дзяцей не відаць было іх. Мала сабраць дзетвару ў парк, яна і сама з вялікай ахвотай прышла. Галоўнае — дапамагчы ёй весела, культурна правесці сваё свята, арганізаваць масавыя гульні, танцы, каб дзеці маглі сапраўды павесяліцца. І ў гэтым ім ніхто не дапамог. А дзе, пытаемся, настаўнікі, раўнікі комсамольскіх і піонерскіх нізацый? Лягчэй за ўсё было насадзіць духавы аркестр на танцавальнай пляцоўцы і іграць дзецям... фокстроты. Яны іх вельмі захапілі, і гэта маглі бачыць самі арганізатары, каб яны былі там. Пасля выступлення ўдзельнікаў самадзейнасці, большасць дзяцей пайшла брадзіць па парку і толькі невялікая частка засталася штурмаваць танцавальную пляцоўку, адкуль, да рэчы, дзетвару хутка выпіснулі дарослыя.

Г. Будай.

**Репортаж о мероприятиях для пионеров и школьников г. Бреста, посвященных окончанию учебного года**

Газета «Заря» за 18 июня 1941 г.

**Да ведама рэдактараў насценных газет прадпрыемстваў, устаноў і арцеляў гор. Брэста.**

**Пры рэдакцыі газеты „Зара"** (Савецкая 25, другі паверх)

**ПАЧЫНАЕ РАБОТАЦЬ**

***Пастаянны семінар рэдактараў насценных газет***

Першыя заняткі адбудуцца 20 чэрвеня ў памяшканні рэдакцыі. Пачатак семінара ў 7 гадзін вечара.

Просьба да ўсіх рэдактараў своечасова з'явіцца на заняткі.

**Рэдакцыя газеты „ЗАРА"**

**Брэсцкая абласная школа глуханямых дзяцей у БЕЛАВЕЖЫ**

**Аб'яўляе набор дзяцей у школу**

У школу прымаюцца дзеці ад 7 да 14 год. Заяву аб прыёме, даведку аб соцстановішчы бацькоў, метрыку і даведку аб стане здароўя накіроўваць па адрасу: **Белавежа, Піонерская вул. № 23.**

Дакументы прымаюцца да 10-га жніўня. Прыём з 20-га жніўня па 25-га. Залічаныя ў школу дзеці забяспечваюцца інтэрнатам, харчаваннем і вопраткай.

**Дырэкцыя школы.**

**Объявления, опубликованные в газете «Заря» за 18 июня 1941 г.**

# РАСПАРАДЖЭННЕ № 7

**Выканаўчага камітэта Брэсцкага горсовета дэпутатаў працоўных ад 10 чэрвеня 1941 года**

## АБ РЭГІСТРАЦЫІ ТРАНСПАРТНЫХ СРОДКАЎ

**У мэтах правядзення рэгістрацыі транспартных сродкаў выканком Брэсцкага горсовета РАШЫЎ:**

1 Абавязаць ўсіх грамадзян горада, а таксама ўсе ўстановы і прадпрыемствы, знаходзячыяся на тэрыторыі г. Брэста, зарэгістрыраваць у комунальным аддзеле выканкома Брэсцкага горсовета маючыяся ў іх транспартныя сродкі (легкавыя і ламавыя ізвозы і веласіпеды).

2. Рэгістрацыю вытвараць адначасова з уплатай падатка за транспартныя сродкі (узымаемага на падставе пастановы выканкома гор. Брэста ад 26 XI 1940 г.).

3. За кожны выданы рэгістрацыйны знак узымаць аплату ў размеры 3 руб. 55 кап.

4. Тэрмін рэгістрацыі ўстанавіць да 30 чэрвеня г. г.

5. Віноўных у парушэнні гэтага распараджэння прыцягваць да адміністрацыйнай адказнасці — штрафу да 100 руб. або папраўча-працоўных работ да 14 дзён.

6. Нагляд за выкананнем гэтай пастановы ўскласці на органы РК Міліцыі гор. Брэста.

7. Гэта распараджэнне ўваходзіць у сілу праз пяць дзён з дня яго апублікавання і сапраўдна на працягу аднаго года.

**Выканком горсов**

**Распоряжение Брестского горисполкома от 10 июня 1941 г. о регистрации транспортных средств**

Газета «Заря» за 18 июня 1941 г.

**Заметка о проведении в г. Бресте заключительного концерта олимпиады детской художественной самодеятельности**

Газета «Заря» за 19 июня 1941 г.

## Заключны канцэрт Брэсцкай гарадской алімпіяды дзіцячай творчасці

Як на вялікую ўрачыстасць сабраліся 16 чэрвеня школьнікі, іх бацькі, прадстаўнікі партыйных, комсамольскіх і совецкіх арганізацый у гарадскі тэатр. Кожны з прысутных з нецярпеннем чакаў пачатку заключнага канцэрта другой алімпіяды дзіцячай творчасці.

У 7 гадзін 30 мінут шырока раскрыўся занавес. Сцэна мела незвычайны выгляд. На вялікім палотнішчы таленавітай рукой мастака быў паказан лес — ціхі, прыгожы. На сцэне, нібы кветкі, размясціліся ў разнастайным убранні дзесяткі ўдзельнікаў канцэрта — школьнікі Брэста.

Канцэрт пачаўся літаратурна-музыкальным мантажом «Пісьмо беларускага народа вялікаму Сталіну». Выкананне было ўдалым.

Літаратурна-музыкальны мантаж змяняюць індывідуальныя нумары. Вучань 12 яўрэйскай школы Самуіл Монхайт з майстэрствам дэкламіруе верш «Боевые друзья» Лебедзева-Кумача. Добра дэкламіруюць «Песню аб Сталіне» Джамбула — Рахіль Амбаш (вучаніца 13 яўрэйскай школы), «Русским друзьям» Міцкевіча — Хана Чаркоўская (вучаніца 7 польскай школы).

Вялікае ажыўленне выклікала ў прысутных песня «Малы воін» у выкананні вучня 7 польскай школы Руцінскага. Яму горача апладыравалі дарослыя і школьнікі.

Песні змяніліся танцамі. Вучань трэцяга класа 15 школы Левін выдатна выканаў танец «Кабардзінку». Не з меншым поспехам выканала «Цыганскі танец» вучаніца 11 беларускай школы Зажарская.

Індывідуальныя танцы ўступаюць месца калектыўным. Прысутныя з аднолькавай любоўю апладыруюць выканаўцам рускага народнага танца, беларускага, яўрэйскага, польскага. Па майстэрству выканання асабліва выдзеліліся танец «Чардаш» у выкананні танцавальнага калектыва Дома піонераў пад кіраўніцтвам тав Любошыц, польскі народны танец «Куявяк» у выкананні танцавальнага калектыва школы № 1 пад кіраўніцтвам тав. Слівінскай, «Танец конікаў» у выкананні вучняў 12 школы пад кіраўніцтвам тав. Фішалевіч.

Вялікім поспехам карыстаўся ў гледача балет «Красная шапочка» ў выкананні калектываў Дома піонераў і школы № 6.

Нямала было прадстаўлена на заключным канцэрце і харавых калектываў. Асаблівай папулярнасцю карысталіся харавыя калектывы Дома піонераў і школы № 12. Калектыў Дома піонераў пад кіраўніцтвам тав. Власава добра выканаў песні «Агні большэвіцкіх ідэй», сталінскія частушкі. Харавы калектыў 12 школы пад кіраўніцтвам тав. Кюмеля выканаў «Гімн партыі большэвікоў», песню «Бірабіджан» з кінофільма «Шукальнікі шчасця».

Бліскуча выканалі фізкультурныя піраміды вучні школы № 2.

Канцэрт закончыўся балетам—рускі харавод у перыяд татарскага нашэствія. Выканаўцы яго, вучні школы № 5, пад кіраўніцтвам тав. Хмялеўскай прадэманстравалі выключныя здольнасці. Пасля сканчэння канцэрта па залу доўга раздаваліся дружныя воплескі.

У заключным канцэрце алімпіяды дзіцячай мастацкай творчасці прыняла ўдзел 568 навучаючыхся школ горада. Яны выканалі 45 індывідуальных і калектыўных нумароў.

Г. Паўлаў.

## НОВЫЯ МАЛОЧНЫЯ ЗАВОДЫ

У Брэсце заканчваецца будаўніцтва і абсталяванне гарадскога малочнага завода. Ён будзе выпускаць пастэрызаванае малако, малочна-кіслыя прадукты, марожанае. Завод разлічан на перапрацоўку 15 тон малака ў змену. Кошт прадпрыемства — каля 300 тысяч рублёў.

Выдзелена поўмільёна рублёў на пабудову ў Беластоку новага гарадскога малочнага завода, які павінен быць гатоў да сезона 1942 г. Праект складзен Беластоцкім філіялам Белдзяржпраекта.

Пры масласырзаводах у заходніх абласцях рэспублікі намечана арганізацыя двух першых у БССР цэхаў сухога абястлушчанага малака. Цэхі будуць перапрацоўваць адыходы ад масларобства. Абястлушчанае малако прымяняецца ў хлебапячэнні, кандытарскай і марожанай вытворчасці.

**Заметка о строительстве молочного завода в г. Бресте**

Газета «Заря» за 19 июня 1941 г.



СЁННЯ Ў КІНОТЭАТРАХ

Кінотэатр 1 МАЯ
ХЛОПЕЦ З ТАЙГІ
Пачатак сеансаў 6, 7.45, 9.30, 11.15

Кінотэатр „КІМ"
ПЕСНЯ АБ ЛЮБВІ
Пачатак сеансаў 5, 6.30, 8, 9.30, 11.

ПАРК ІМЕНІ 1-га МАЯ

21 чэрвеня 1941 г.

22 чэрвеня 1941 г.

ДВА КАНЦЭРТЫ

Беларускай Дзяржаўнай Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармоніі

ДЗЯРЖАЎНЫ ХОР БССР

Мастацкі кіраўнік І. Г. БАРЫ.

У ПРАГРАМЕ:

Творы савецкіх кампазітараў, руская і заходне-еўрапейская класіка.
Песні народаў СССР (беларускія, рускія, яўрэйскія, украінскія малдаўскія, армянскія і др.)

У канцэрце ўдзельнічаюць:

А. О. САВІЦКІ (аккардыён), В. В. БАСОЎ (мастацкае слова).

Пачатак ў 9 гадзін 30 мінут вечара, каса з 4-х дня.



Кінотэатр 1 МАЯ
ХЛОПЕЦ З ТАЙГІ
Пачатак сеансаў 6, 7.45, 9.30, 11.15

Кінотэатр „КІМ"
ПЕСНЯ АБ ЛЮБВІ
Пачатак сеансаў 5, 6.30, 8, 9.30, 11.

ГОРТЭАТР

Гастролі тэатра музыкальнай камеды БССР

21 і 22 чэрвеня
апошнія два спектаклі

ЭРВЕ
М-ЛЬ НІТУШ
(Пансіён нябесных ластавак)

Пачатак у 9 гадзін вечара. Каса адкрыта з 12 да 3 гадзін дня і з 5 да 9 гадзін 30 мінут вечара.

**Объявления, опубликованные в газете «Заря» за 20 и 21 июня 1941 г.**

Вставай, страна огромная,
Вставай на смертный бой,
С фашистской силой темною,
С проклятою ордой!

Пусть ярость благородная
Вскипает, как волна!
Идет война народная,
Священная война! ...

«Священная война»
Слова В. Лебедева-Кумача
Музыка А. Александрова



Выставка подготовлена по документам и материалам Государственного архива Брестской области и открытым интернет-источникам

Брест, 2026